Не пакідайце ж мовы нашай беларускай,
каб не ўмёрлі! Францішак БАГУШЭВІЧ

Наша слова

ТАВАРЫСТВА БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ ІМЯ ФРАНЦІШКА СКАРЫНЫ

№ 36(46) • 23—29 КАСТРЫЧНІКА 1991 г. • Штотыднёвік Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны
Кошт 10 кап. (па падпісцы — 5 кап.)

Поступ тыдня

ПАДПІСАНЫ ДАГАВОР АБ ЭКАНАМІЧНЫМ СУПОЛЬНІЦТВЕ СУВЕРЭННЫХ ДЗЯРЖАЎ. АД ІМЯ БЕЛАРУСІ ПОДПІС ПАСТАВІЎ СТАРШЫНЯ РЭСПУБЛІКАНСКАГА ПАРЛАМЕНТА С. С. ШУШКЕВІЧ. Па яго словах, у жыцці краіны пачынаецца новы этап: раней толькі разбуралася цэнтральная эканоміка, цяпер узнікла магчымасць для яе будаўніцтва. НЕ ЗРАЗУМЕЛА ТОЛЬКІ, ЧАМУ ТАКІЯ РЭСПУБЛІКІ, ЯК УКРАІНА, МАЛДОВА, ГРУЗІЯ, АЗЕРБАЙДЖАН, НЕ СПЯШАЮЦЦА ДАЛУЧЫЦЦА ДА ПАГАДНЕННЯ...

АБ'ЯЎЛЕНА АБ ТЫМ, ШТО З ГЭТАГА ТЫДНЯ СССР ФАКТЫЧНА БУДЗЕ УТВАРАЦЦА УСЯГО З СЯМІ РЭСПУБЛІК. *Тых, якія прымуць удзел у сесіі Вярхоўнага Савета краіны. Сярод іх, безумоўна, будзе і Беларусь.*

ПРАЦЯГВАЮЦЦА ПАСЯДЖЭННІ беларускага парламента. Абраны новы пракурор рэспублікі, прынятыя законы аб грамадзянстве, аб сацыяльнай абароненасці інвалідаў, заслуханы даклад Старшыні Савета Міністраў.

А. ПА СУСЕДСТВУ, НА ШЫРОКАЙ ПЛОШЧЫ, ІДЗЕ ІНШАЕ ПАСЯДЖЭННЕ. ТУТ САБРАЛІСЯ НЕЗАДАВОЛЕНЫЯ, ТЫЯ, КАГО ПАКРЫЎДЗІЛІ БЫЛЫЯ І СЕННЯШНІЯ ЎЛАДЫ. Яны размясціліся ў сваім палатачным гарадку. Пакуль што не надта прыслухоўваюцца да іх галасоў. Таму і аб'яўлена аб новых захадах «палатачнікаў»: пачынаецца галадоўка.

ДАСЯГНУТА ПАГАДНЕННЕ ПАМІЖ ПАРЛАМЕНТАМІ ДЗВЮХ СУСЕДНІХ РЭСПУБЛІК: В. ЛАНДСБЕРГІС ВЫСТУПАЕ З ПРАМОВАЙ ПЕРАД ПАРЛАМЕНЦКІМІ ДЭПУТАТАМІ У МЕНСКУ, С. ШУШКЕВІЧ — У ВІЛЬНЮСЕ.

«Не магу застацца стрыманай, калі ў якой-небудзь установе робіцца гвалт над роднай маёй мовай».

Стар. 2.

А ў Гоцку кажуць «Мігрыць»...

Стар. 3.

Іду на Кардэна

Стар. 4.



Бел-чырвона-белы ўзняты!

«Пад гербам «Пагоня» нічога не баюся...». Такімі словамі пачынаўся верш, які чытала на плошчы ў пасёлку Лясны сямігадовая Алена, вучаніца Бараўлянскай гімназії.

А пачалося ўсё раней, калі на сесіі Бараўлянскага сельскага Савета была падтрымана прапанова сяброў мясцовай суполкі Беларускай сацыял-дэмакратычнай грамады аб правядзенні ўрачыстага мітынгу, прысвечанага ўзняццю дзяржаўнага сцяга Рэспублікі Беларусь над будынкам сельскага Савета. Была вызначана дата — 1 кастрычніка 1991 года.

Каля 400 жыхароў пас. Лясны прыйшлі на мітынг. Як добрую прыкмету ўсе ўспрынялі тое, што перад пачаткам мітынгу неба праяснела і засвяціла сонца, хаця на працягу дня некалькі разоў ішоў дождж.

З уступным віншавальным словам выступіў М. І. Хадасевіч, член Цэнтральнай Рады БСДГ. Затым настаўнік Бараўлянскай школы-гімназіі І. А. Будай зрабіў кароткі гістарычны агляд развіцця нацыянальнай сімволікі ў Беларусі.

І вось пад гукі песні «Спадчына» вучні, адзетыя ў нацыянальныя касцюмы, выносяць дзяржаўны сцяг Рэспублікі Беларусь — бел-чырвона-белы. Чуюцца апладысменты. На імправізаваным канцэрце прагучалі вершы беларускіх паэтаў, дзіцячы танцавальны калектыў «Светлячок» (кіраўнік А. А. Суцько) выканаў танец «Ляснянская задорная». Вакальная група (кіраўнік І. В. Шакава) спявала беларускія народныя песні.

З дапамогай суполкі ТБМ быў арганізаваны продаж значкоў і вымпелаў з нацыянальнай сімволікай, літаратуры на беларускай мове.

Георгій ГАЦКЕВІЧ,
старшыня Бараўлянскай суполкі БСДГ, дэпутат Бараўлянскага сельскага савета Менскага раёна.

Вывучайце гісторыю рэспублікі

Распачаў працу Народны універсітэт «Гісторыя і культура Беларусі» пры Менскай гарадской радзе БНФ «Адраджэнне».

Праграма прадугледжвае асвятленне важных момантаў нашай гісторыі, якія хвалююць грамадства, абуджанае да новага культурнага будаўніцтва, да адраджэння Бацькаўшчыны. Сярод праблемных лекцый — этнагенез беларусаў, Полацкае княства, дахрысціянская культурная спадчына. Вялікі раздзел прысвечаны перыяду Вялікага Княства Літоўскага.

Лектары народнага універсітэта — вядомыя спецыялісты, выдатныя знаўцы нашай гісторыі, супрацоўнікі навукова-даследчых устаноў беларускай сталіцы. Сярод іх: Г. Штыхаў, М. Чарняўскі, У. Арлоў, М. Ермаловіч, М. Ткачоў. Уваход платны.

ВАСІЛЬ БЫКАЎ: Наша нацыя, калі мець на ўвазе нават тую вайну, не мела патрэбы ў героях. Герояў хапала, але ўся справа ў тым, як адносіцца да іх.

Працяг справаздачы аб сустрэчы Васіля Быкава ў клубе «Спадчына» чатайце на 2-й стар.

Але! *Але!*

«Сюрпрыз» «Чырвонай змены»

Чаго толькі не робяць зараз газеты і часопісы ў барацьбе за чытача. Шукаюць багатых спонсараў. Самым нечаканым чынам рэкламуюць свае выданні. Заінтрыгавала і ўсхвалявала чытачоў «Чырвоная змена» абвесткай пра «прыемны сюрпрыз», што чакае іх у наступным годзе. Забягаючы наперад, скажу, што апошнім часам газета змясціла шмат вострых надзённых матэрыялаў, у тым ліку і ў абарону роднай мовы. Выходзілі старонкі «Роднага слова», якія рыхтуе малады празаік Уладзімір Міхно, шмат публікавалася твораў маладых паэтаў, празаікаў, крытыкаў — сяброў літаб'яднання «Крыніцы». Тым больш здзіўляе рэкламная абвестка газеты. Цытую: «Прыемны сюрпрыз чакае тых, хто вырашыў падпісацца на «Чырвоную змену» ў 1992 годзе. Пры жаданні вы атрымаеце магчымасць адначасова падпісацца і на серыю «Бібліятэка жаночага рамана» (на рускай мове), якую будзе выдаваць газетна-выдавецкая фірма «Белая Русь». Дванаццаць бестселераў сусветнай літаратуры ў пятнаццаці тамах перакладзены ў нашай краіне ўпершыню. Іх агульны кошт — 172 рублі...»

Як бачым, «Чырвонка» са сваім дадаткам мае шанц трапіць на ўсесаюзны газетна-часопісны рынак. Вось толькі якую паслугу яна робіць Рэспубліцы Беларусь?

Канечне, сама ідэя дадатку вартая сур'ёзнай увагі. Але чаму б яе не здзейсніць з клопатам пра беларускае слова? Чаму, для прыкладу, беларускай маладзёжнай газеце не выдаць у дадатку той жа цыкл «жаночых» раманаў, але па-беларуску?

У гэтым сэнсе здзіўляе і дзейнасць фірмы «Белая Русь». Сама назва з нейкім незразумелым падтэкстам. Не «Беларусь», а нешта іншае? Скажам, «расійскі» яе варыянт? Загадка. Але ці не разгадваецца яна, калі ўважліва прачытаць выдавецкі праспект новай фірмы?

Алесь КАРЛЮКЕВІЧ.

З рэдакцыйнай пошты

Як я «абразіла» прадаўцоў універмага «Беларусь»

Жыву я непадалёку ад вядомага на ўсю рэспубліку ўнівермага «Беларусь». Аднойчы зайшла ў аддзел «Культтавары». Запыталася, ці ёсць у продажы стужка для пішучых машынак. Мая беларуская мова прагучала для гандляроў як абраза. Колькі выслухала слоў абурэння, нават знявагі, за тое, што запыталася па-беларуску! І ад каго? Ад маладых жанчын, кожная з якіх, відаць, мае сярэднюю адукацыю. Да таго ж самі яны, мне падалося, з вёскі, бо ў іх лексіконе — элементарная «трасянка». Не ведаюць прадаўцы ні рускай мовы, ні беларускай.

Я не магла стрываць. Звярнулася да дырэктара ўнівермага з пісьмовай скаргай. У сваім лісце бараніла родную мову. Зазначыла і тое добрае, што ўсё ж мае месца: ва ўнівермагу па радыё жанчына-дыктар знаёміць пакупнікоў з новымі таварамі, запрашае набыць пакупкі. Гаворыць яна на добрай беларускай мове! Нават іншаземцы неяк заўважылі гэтую дэталь. У лісце да дырэктара я папрасіла адзначыць працу дыктара падзякай.

Неўзабаве атрымала адказ. І вось што ў ім: «Уважаемая т. Ярошевич М. Я.! Ваше заявление доведено до сведения всех работников универмага и обсуждено на производственном совещании «День качества». Одновременно сообщаем, что в универмаге будут организованы курсы для работников торгового зала по изучению белорусского языка. И.о. директора В. В. Дубовик».

Хочацца спадзявацца, што ў хуткім часе ва ўнівермагу «Беларусь» не толькі дыктар загаворыць па-беларуску.

Я чытаю «Наша слова» з самых першых яго нумароў. І рада, што ёсць на Беларусі гэтакая газета. Вядома, як цяжка прабіваецца да вольнага, шырокага ўжытку роднае слова. Як пагарджаюць ім многія так званыя «рускія», а дакладней — беларусы, якія «говорят на русском языке», бо ім здаецца, што так яны бліжэй да начальства. Не магу застацца стрыманай, калі ў якой-небудзь установе робіцца гвалт над роднай маёй мовай. Супраціўляюся, абараняю яе годнасць, яе права на дзяржаўнасць. Запаўняю розныя бланкі па-беларуску, не зважаючы на незадаволенасць начальнікаў. Усюды гавару на роднай мове. Лічу, што гэта мой грамадзянскі абавязак і сціплы ўклад у адраджэнне Беларусі.

Марыя ЯРАШЭВІЧ.
г. Менск.

У суполках ТБМ

Вячоркі будуць рэгулярнымі

У канцы верасня ў «Беларускай хатцы» маладзёжная арганізацыя «Выбранецкія шыхты» зладзіла хрэсьбіны Незалежнасці Беларусі. Вячоркі адкрыліся лялечным спектаклем, які з сапраўдным акцёрскім майстэрствам вёў Сяржук Вітушка. Госці, як зачараваныя, сачылі за тым, што адбывалася на сцэнах-ярусах Батлейкі.

Пасля крэслы ў пакоі былі рассунутыя, зайграў гармонік, і пачаліся гульні, танцы, загучалі песні. Таньчылі польку, падыспань, кракавяк — хто як мог, ды так, што падлога дрыжэла, спявалі беларускія народныя песні і нават расійскія раманы.

Цікавае паведамленне пра старажытныя традыцыі беларускага ткацтва зрабіў для выбранцаў мастак Фёдар Кашкурэвіч. Лагічным вынікам яго выступу з'явілася ідэя стварэння атэлье рытуальных строяў.

Ніхто і не заўважыў, як прыйшоў час развітвацца, а так не хацелася. Суцяшала адно: вячоркі ў «Беларускай хатцы» будуць рэгулярнымі.

Вольга МІХАЙЛІК,
сябра маладзёжнай арганізацыі «Выбранецкія шыхты».

Факты сённяшняга дня



Старадаўні асабняк па вуліцы Пушкінскай, дзе яшчэ зусім нядаўна знаходзіўся Брэсцкі гаркам, перададзены пад выставачную залу абласнога краязнаўчага музея. Жыхары і госці горада паспелі ўжо пазнаёміцца тут з такімі цікавымі экспазіцыямі, як выстаўка рэпрадукцый М. Рэрыха, «Брэстчына ў старых паштоўках», «Фларыстыка Ганны Салаўёвай» і гісторыка-этнаграфічнай. Цяпер тут разгорнута вялікая экспазіцыя карцін з фонтаў Дзяржаўнага мастацкага музея «Рускі жывапіс другой паловы XIX стагоддзя».

НА ЗДЫМКУ: зала, дзе размешчана этнаграфічная выстаўка.
Фота Эдуарда КАБЯКА (БЕЛТА).

Васіль БЫКАЎ: Час імперыі мінуў

(Заканчэнне. Пачатак у № 35).

Алесь ЛІПАЙ. Наколькі сур'ёзна вы ставіцеся да парасткаў імперскіх тэндэнцый такіх арганізацый як «Отечество», «Русь» і «Белая Россия»?

Васіль БЫКАЎ. Такія парасткі, зразумела, будуць расці, таму што гэтыя шавіністычныя тэндэнцыі панавалі ў нас столькі гадоў, і яны не знікнуць адразу з прыняццем дэкларацыі аб суверэнітэце. Яны будуць існаваць, іх дзейнасць будзе працягвацца, і, зразумела, яны прынясуць шмат непрыемнасцей нашай суверэннасці. Але я хачу сказаць вось яшчэ што: у тым, што яны існуюць і будуць працаваць, не толькі віна тых людзей, а гэта іх бяда, бо яны не могуць выйсці з зацыкленасці. Іх можна толькі пашкадаваць. Я думаю, што з такімі людзьмі трэба дыскутаваць спакойна, без нервознасці, без нянавісці. Але ж калі не будзе ў іх падтрымкі, то яны самі доўга не праіснуюць. Самае небяспечнае — гэта нервознасць з абодвух бакоў.

Мікалай КРУКОЎСКІ (прафесар БДУ). Васіль Уладзіміравіч, як вы думаеце, ці ўся праўда сказана пра вайну?

Васіль БЫКАЎ. У нашай гісторыі панаваў і пануе «избирательный метод»: з гісторыі выбіраюцца пэўныя падзеі, найбольш прымальныя для рэжыму, і яны затым вывучаюцца і прапагандуюцца. Так будуецца патрэбная палітыка. Другая сусветная вайна — гэта не толькі чатыры гады бойкі, але і вялікая эпоха ў нашай гісторыі. Прайшло пасля яе шмат гадоў, шмат пра вайну напісана, але поўная праўда пра яе не сказана. І асабліва гэта адносіцца да барацьбы з фашызмам на нашай тэрыторыі. Тут была вельмі складаная сітуацыя, у якой праявіліся ўсе тэндэнцыі: і самыя высакародныя, і самыя нізкія. Іменна ў гады вайны беларускі народ высока засведчыў сваю рэпутацыю. І калі ў свеце пра Беларусь што-небудзь ведаюць, дык гэта ў першую чаргу звязана з вайной, у тым ліку з партызанскай барацьбой. Я разумею: было многа несправядлівага і з боку партызан, таму я думаю, калі запануе поўная дэмакратыя, нашы вучоныя дабяруцца да ўсіх аспектаў гэтай барацьбы, і ўсё будзе пастаўлена на свае месцы. Вы ж ведаеце, што некалі настольнай кнігай па партызанскай тэме быў двухтомнік Цанавы. Па ім ўсе вывучалі вайну. Яшчэ і ў наступным стагоддзі нам давядзецца вывучаць мінулую вайну, каб дайсці да праўды.

Лявон ЛІПЕНЬ. Паважаны Васіль Уладзіміравіч, у чым вы бачыце найбольшы ўклад сённяшніх дэмакратычных сіл у Беларусі і ў чым слабасць беларусаў?

Васіль БЫКАЎ. Уся справа ўпіраецца ў нізкую нацыянальную самасвядомасць. А зусім нядаўна гэта і не патрэбна было, бо перад людзьмі ставілі адну мэту — зліццё нацый. Цяпер, калі з'явіліся ўмовы, іменна нацыянальная самасвядомасць вырашае ўвесь лёс нацыі. Не эканоміка, не палітыка, бо ўсё гэта «преходящее», а нацыянальная самасвядомасць — той капітал, які нельга ўзяць у крэдыт за мяжой, а толькі як спадчыну ад продкаў. На жаль, беларусы яго не захавалі, і ў гэтым наша няшчасце.

Яўген ГУЧОК. Які, на вашу думку, ваш самы лепшы твор?

Васіль БЫКАЎ. Самы лепшы твор — гэта той, які яшчэ не напісаны. Ніхто не пачынае пісаць новы твор, як горшы, а як самы лепшы. Ну, а поспех залежыць ад многіх прычын, а некаторыя прычыны не залежаць ад аўтара. А наогул кажучы, цяпер літаратурная творчасць не самае цікавае, пра што можна гаварыць.

Мікалай ЯКІМОВІЧ. Я чуў, што ў час вайны, перабіўшы камандзіраў, салдаты здаваліся ў палон. Магло быць такое ці не?

Васіль БЫКАЎ. Я не чуў пра такое, каб, перабіўшы камандзіраў, салдаты здаваліся ў палон. І ці была ў гэтым патрэба, бо ў палон здаваліся і з камандзірамі, ды і самі камандзіры здаваліся. Выпадкі, відаць, і былі, бо на вайне ўсё было.

Віктар НОВІК. Як вы ставіцеся да таго, каб ваша кандыдатура была вылучана на пост прэзідэнта Беларусі?

Васіль БЫКАЎ. Я стаўлюся да гэтага абсалютна адмоўна, бо ў бліжэйшы час наогул канчаю з палітыкай і буду ўхіляцца ад розных інтэрв'ю, гутарак і г.д. Я хачу спакойна папрацаваць і закончыць тыя рэчы, якія ляжаць у мяне на стале. У нас ёсць вартыя кандыдатуры на высокія пасады, і народ іх выбера, калі захоча сабе добрай долі. А калі не, дык тады будзе Малафееў і яго каманда.

Анатоль БЕЛЫ (старшыня клуба «Спадчына»). Улічваючы новыя звесткі пра вайну, ці змянілі вы некаторыя дэталі ў сваіх творах ці не? Ці будзеце працягваць распрацоўваць і далей тэму вайны?

Васіль БЫКАЎ. Мяне цяпер найбольш цікавіць не вайна, а трыццатыя гады, бо многае, што адбылося ў час вайны — гэта вынік падзей, якія былі перад ёй. Вялікі гвалт супраць народа не мог не адбіцца на вайне. А наконт змен у творах, то, безумоўна, улічваючы новыя звесткі пра вайну, я раблю належныя карэкціроўкі, але гэта не заўсёды магчыма.

Алена ДРАЗДОВІЧ. Ці абавязаны пісьменнік стварыць новага нацыянальнага героя, з якога можна было б браць прыклад моладзі?

Васіль БЫКАЎ. Трэба зразумець, што ў адносінах да мастацтва і літаратуры пісьменнік нічога не абавязаны, ён не падпарадкоўваецца ніякай тэндэнцыі, ніякай сістэме. Ён мае справу толькі з Богам. Гэта наша палітыка давяла нас, што мы ўсе абавязаны падпарадкоўвацца існуючай сістэме. Вазьміце класіку, літаратуру мінулага, калі не было ўплыву палітыкі на творцу,— усе творы выглядаюць інакш. Гэта не значыць, што тады не было ідэалогіі, палітыкі, і калі нешта рабілася палітычнае творцам, то рабілася без усялякіх абавязкаў, без уціску з боку грамадства.

Мастацтва павінна быць абсалютна свабодным, вось толькі тады яно на нешта здольнае. Цяпер, што датычыць нацыянальнага героя, то я сабе не ставіў такіх задач, каб стварыць нацыянальнага героя, бо лічыў, што самы плённы падыход — паказваць жыццё такім, якое яно ёсць. Жыццё наша далёка не ідэальнае, і герояў ці варта шукаць, бо ёсць такое выказванне: «Няшчасная нацыя, якая мае патрэбу ў героях». Зразумела, гэта адносна. Наша нацыя, калі мець на ўвазе нават тую вайну, не мела патрэбы ў героях. Герояў хапала, але ўся справа ў тым, як адносіцца да іх. Возьмем тую ж Осіпаву і Мазанік, якія забілі Кубэ. Так, гэта гераізм, а тое, што 10 тысяч нявінных людзей былі расстраляны за Кубэ, нікім не прымаецца пад увагу. А гэта ж усё, між іншым, цесна звязана.

Яўген ГУЧОК. Васіль Уладзіміравіч, ці думаеце напісаць твор мемуарнага характару?

Васіль БЫКАЎ. Каб пісаць мемуары, трэба мець асаблівы склад характару. Я не адношуся да тых людзей, якія вядуць нейкія запісы і маюць запісныя кніжкі, і не стараюся запамінаць, што са мной было. Але чытаць мемуары я люблю, і, скажам, калі напісаць кулуарны летапіс сучаснай беларускай літаратуры — гэта было б вельмі і вельмі цікава. Я ведаю, што ёсць такі чалавек, які вядзе летапіс накшталт «Лысай гары», толькі ў прозе. Думаю, гэта некалі будзе вельмі цікава.

Ала КАЖЭРА. Васіль Уладзіміравіч, як вы лічыце, праявы чалавечай подласці—гэта прыроджаная якасць ці набытая?

Васіль БЫКАЎ. Можа быць і прыроджанай, можа быць і набытай, але нейкую заканамернасць тут прасачыць вельмі цяжка. Часам у абсалютна амаральным асяроддзі вырастае чыстая і разумная істота, і наадварот.

Алесь ЛІПАЙ. Як вы характарызуеце сённяшні стан беларускай літаратуры?

Васіль БЫКАЎ. Беларуская літаратура цяпер, відаць, як і наогул савецкая літаратура, перажывае нейкі фол, і гэта зразумела, бо на літаратуру абрынуўся цэлы каскад падзей і знамянальных з'яў самага рознага парадку, таму многія літаратары проста разгубіліся. Я думаю, што так працягвацца доўга не будзе. У нас ёсць таленавітыя людзі, і трэба спадзявацца, што будзе напісана шмат цікавага.

Лілія МАТУСЕВІЧ. Чаму ў наш час такія пасіўныя пісьменнікі?

Васіль БЫКАЎ. Каб толькі пісьменнікі не хадзілі на мітынгі, дык гэта яшчэ паўбяды, але ж многія з іх выступалі супраць мітынгаў, супраць забастовак, падтрымоўвалі палітыку кампартыі, змагаліся з Беларускім Народным Фронтам. Усе гады пісьменнікі былі рычагамі партыі, у іх было кіраўніцтва, якое ставілася са згоды ЦК партыі, у іх была вялікая партыйная арганізацыя... І калі вы думаеце, што папулярныя пісьменнікі — гэта галоўнае начальства, то вы памыляецеся. На самой справе таленавітыя пісьменнікі ў Саюзе пісьменнікаў заўсёды сядзяць на задніх лаўках, а балем правяць зусім іншыя людзі, якіх вы не ведаеце і можа ніколі не будзеце пра іх ведаць... Я ўжо не кажу пра дзесяткі іншых актыўных камуністычных рычагоў. Адных толькі сексотаў там па меншай меры палавіна. І вы хочаце, каб яны хадзілі на мітынгі?

Генадзь САКАЛОЎ. Ці існуе інфармацыйная блакада Беларусі?

Васіль БЫКАЎ. Для таго, каб маскоўскія выданні друкавалі звесткі з Беларусі, патрэбны пэўныя захады ўласных карэспандэнтаў, што ёсць у рэспубліцы. Ніводны наш карэспандэнт, які працуе, напрыклад, у «Правде», не прызначаны ў Маскве, а ўсё рабілася ў нас у ЦК. Можаце ўявіць, у чым зацікаўлены і каму служылі гэтыя людзі. Усе вы памятаеце, як Алесь Адамовіч назваў Беларусь Вандэяй перабудовы, і беларускае кіраўніцтва ўсе гэтыя гады апраўдвала гэтую назву. У нас стрымліваліся дэмакратычныя працэсы і ўсё астатняе, што датычылася перабудовы, і гэта стварыла пэўны імідж у народаў краіны пра Беларусь. Цяпер існуе такая думка, што расійская дэмакратыя кепска адносіцца да Беларусі з прычыны сваёй імперскай ідэалогіі. Але не толькі з гэтай прычыны, а і з таго, што за апошнія гады Беларусь засведчыла сябе з самага рэакцыйнага боку. То чаму Ельцын павінен добра адносіцца да нашай рэспублікі, якая ўсе гэтыя гады ўлагоджвала Лук'янава і Гарбачова і не падтрымлівала расійскі парламент? Гэта не распаўсюджваецца на народ, а Ельцын і не гаворыць пра народ, а пра кіраўніцтва. Дык што рабіць? Два гады назад у Маскве я расказваў Гарбачову пра падзеі 30 кастрычніка, а ён не верыў і глядзеў на мяне і паціскаў плячыма: «Ну, почему же так? Ну, как это было?» Там жа, у Маскве, я даведаўся, што ў многіх была такая інфармацыя пра 30 кастрычніка, што гэта быў путч нацыяналістаў з мэтай захопу ўлады, які паспяхова падавіла міністэрства ўнутраных спраў.

Лявон ЛІПЕНЬ. Ці адказвае народ за сваю ўладу?

Васіль БЫКАЎ. У канцы сваіх дзён Гітлер наракаў на свой народ, які не здзейсніў яго задум. Але праўда заўсёды на баку народа. Народ, які дазваляе сябе асядлаць і доўга церпіць, то народ таго значыць і варты.

Анатоль БЕЛЫ. Як вы думаеце, чым нам можа дапамагчы беларускае замежжа?

Васіль БЫКАЎ. На гэту тэму мне нават сорамна гаварыць, таму што, відаць, унікальны ў гісторыі выпадак, калі метраполія просіць дапамогі ў сваёй няшчаснай, выгнанай у свой час, дыяспары,— гэта жахліва. Беларусы, якія жывуць за мяжой, свой дабрабыт нажылі цяжкай працай, і цяпер мы, якія палівалі іх гразёй, не лічылі іх за людзей, а толькі за здраднікаў і злачынцаў, цяпер мы вядзём з імі гутаркі, каб яны нас кармілі. Гэта амаральна, гэта проста сорамна. І калі яны ідуць нам на дапамогу, дык і ім гэта даецца не так проста.

Беларуская дыяспара вельмі ўнікальная ў тым, што яна зберагла нашу дарэформенную мову. Наша ж партыйная газетчына разбурыла ўсю нацыянальную мову, а што засталося, дык засталося спаганеным. Эміграцыя нам нічога не павінна, а мы павінны ёй.

Падрыхтаваў
Віктар ШНІП.

Скарбы мовы

Я бываю ў розных вёсках Салігорскага раёна, дзе стараюся занатоўваць як мага болей пачутага. Магчыма, нешта з маіх запісаў будзе цікавым і для чытачоў «Нашага слова».

Заўсёды з нецярпеннем чакаю «Наша слова». Шчыры дзякуй за газету, якая так неабходна ўсім нам. На жаль, такіх выданняў — беларускіх не толькі па назве, але і па сутнасці — яшчэ вельмі мала. Хацелася б, вядома, каб іх было болей, але ёсць «ЛіМ», «Наша слова», адроджаная «Наша Ніва»,— і можна жыць. Асабліва мяне прывабліваюць публікацыі пра розныя гаворкі, забытыя словы, цікавыя выразы, таму што даводзіцца самастойна дасканаліць сваю мову. І я вельмі ўдзячная «Нашаму слову» за дапамогу.

Ларыса БОЙКА,
навуковы супрацоўнік
Салігорскага краязнаўчага музея.

А ў Гоцку так кажуць

(Гоцк — вёска на поўдні Салігорскага раёна, адна з найбольш забруджаных радыенуклідамі).

— Е (ёсць) у жанок шчэ і сарачкі, і ручнікі. Бала (бывала) ж у кожнай хаце ткалі. А не аддаюць вам (у музей — Л.Б.), бо ў ямкі дзержаць (падрыхтавалі на смерць).

— Мы ўге (ужо) прывыклі да сваіх слоў, а я була (была) у доктара, дый кажу яму: «У мяне ў вачах мігрыць (мільгаціць)». А ён ніяк не разумее: «Як гэта мігрыць?» Ну, кажу, мігрыць і ўсё. Шчо (што) уге намучыліся мы з ім...

— У нас на карову, якую даюць маладой у пасаг, кажуць «бонда». Мая цётка пайшла замуж у Хорастава, прывяла карову й кажа: «Гэта мая бонда». Дык з яе смяяліся, бо ў іх так не кажуць. А цётку празвалі «Бонда», так мянушка й прыліпла.

— У нас жа раней нічога не було — ані ўхапіць, ані ўкупіць... Ніц на свеце не було, а цяпер у кожнага гэтых ранцей — на воз не пакладзеш (рэнці — купленае адзенне, тканіны, бялізна).

— Нас, малых, як вяселле було, не ўгенялі з хаты. На печ пасядзем і чакаем, калі ўге ладкі (аладкі) пачнуць насіць — то й нам тады перападзе.

— Раней жа мы насілі лапці палосавыя (з ліпавай кары) з раменнымі валокамі (вузкія скураныя раменьчыкі даўжынёй каля 2 м). Анучкі беленькія, а раменныя гэтыя валокі дзёгцем намажам — і так хораша...

— Ваба на радзіны як ідзе, то ў сяўнік і кашу паставіць, і яечэнь напячэ...

— Яна маладая була скокла (любіла танцаваць).

— А дзяцей у той Сцёпкі — бы ўюноў у кашы.

— От, бацца (здаецца) й рабіла б, але сілы ўге няма.

— Ой, дзеткі, даўно я жыву, пражыла ўге валовы век.

— На вяселлі брат маладой трэйко раз (тройчы) паставіць яе на лаву, потым уге малады дасць выкуп.

— Сярод дружак самая лепшая — на ганаровым месцы, а самая малодшая ці няўдалая — закрутка (ідзе апошняй).

Мажэ — можа, пудовіла — пужала, вустаўкі — устаўкі, вушытыя — вышытыя, манешка — манішка, бавеўна — бавоўна, залеза — жалеза, памуць — памыць, забула — забыла, хаджаін — хазяін, пагенуць — паганяць, накладаць — надзяваць, апранаць, узложаць — апрануцца ў нешта, свэдар — вязаная (трыкатажная) кофта, могліцы — могілкі, вусцёпка — варыўня.

Землякі

«НЕ ШКАДУЮ, ШТО Я БЕЛАРУС»

Летась звярнуў увагу на кароткую нататку ў «Чырвонай змене», у якой наш зямляк салдат Паўлюк Быкоўскі расказваў пра дысгармонію, якую павінен адчуваць ваеннаслужачы, калі будзе кіравацца вайсковымі статутамі. Сёння кожнаму хопіць смеласці пакрытыкаваць загады існуючай сістэмы. А Паўлюк Быкоўскі і ўчора не хаваў сваіх поглядаў і, выказваючы іх, не цураўся роднага слова.

Пагадзіцеся, нялёгкая справа — захоўваць адданасць мове, дбаць пра роскі ў правапісе (пісаць Паўлюк стараецца «тарашкевіцай»), калі ты за сотні кіламетраў ад роднай Беларусі. І асабліва няпроста, калі служыш у войску.

Адчуў на сабе Паўлюк і тое, што мова і нацыянальная свядомасць цесна звязаны з палітыкай. Цікавасць радавога Быкоўскага да беларускага Адраджэння хутка заўважылі «асабісты» Маскоўскай вайсковай акругі. Не спадабалася і тое, што гаварыў салдат-беларус падчас путчу, якую ацэнку у прыватных размовах даваў антыканстытуцыйным дзеянням хунты. У віну маладому чалавеку паставілі і яго веравызнанне. Паўлюк Быкоўскі — прыхільнік крышнаітаў. Але салдату пашчасціла, як і ўсім нам,— перамагла дэмакратыя, да яго перасталі чапляцца.

Цяпер Паўлюк рыхтуецца да звальнення ў запас. Як і раней, гаворыць з землякамі па-беларуску. А як надарыцца вольная хвіліна, піша фантастычную аповесць. Адначасова рыхтуецца да паступлення на філалагічны факультэт Менскага педагагічнага інстытута. Марыць Паўлюк усур'ёз заняцца перакладамі на беларускую мову твораў індыйскіх філосафаў.

А.К.

Беларускае замежжа

ПОЛАЦАК

ВЫДАНЬНЕ БЕЛАРУСКАГА КУЛЬТУРНА-АСЬВЕТНІЦКАГА ЦЭНТРА
КЛІЎЛЕНД
ЗША



№ 6-7 1991

Выхадам у свет чарговага нумара (№ 6-7) вітае сваіх чытачоў часопіс «Полацак», што выдаецца ў Кліўлендзе, ЗША. Нумар пачынаецца вершам В. Шніпа «Час прыйшоў...», які прысвечаны абвяшчэнню незалежнасці Беларусі 25 жніўня 1991 г. Вярхоўным Саветам Рэспублікі.

Пад рубрыкай «Наша гісторыя» са сваім артыкулам «Вуніі Вялікага Княства Літоўскага» выступае Іосіф Юхо. Ён аналізуе гістарычнае значэнне саюза паміж Вялікім Княствам Літоўскім і Польшчай, які доўжыўся каля 400 гадоў, і ўплыў гэтага саюза на ўсю гісторыю народаў гэтых дзяржаў. Пра тое, як развівалася музычнае мастацтва ў XVIII ст., чытачы даведаюцца з артыкула Вольгі Дадзіёмавай «Аркестровае выканальніцтва Беларусі». У нумары надрукавана таксама заканчэнне публіцыстычнай аповесці-хронікі ў дыялогах Э. Ялугіна «Свечкі на Дзяды». Анатоль Белы дзеліцца сваімі ўражаннямі, якія ён перажыў на працягу трох вядомых нам жнівеньскіх дзён у Маскве, і коротка расказвае пра нечарговую сесію Вярхоўнага Савета БССР, на якой была абвешчана незалежнасць Беларусі.

Пад рубрыкай «Памяць зямлі» Міхась Белямук публікуе лісты ад Міколы Ермаловіча, дасланыя яму ў 1980—1981 гадах. Тут жа змешчаны ўспаміны Яўгена Ціхановіча. 115-годдзю з дня нараджэння Алаізы Пашкевіч (Цёткі) прысвяціла свой артыкул Юльяна Дубяйкоўская. У артыкуле «Абяздолены мой стромы шлях...» д-р Мацвей Рэпкаў-Смарщчок, даследчык беларускай літаратуры і мастацтва з Мантысэля, расказвае пра малавядомага на Бацькаўшчыне паэта Анатоля Бярозку, зборнік паэзіі «Адзінаццаць вершаў» якога ён выдаў у Мінасоце (ЗША) у 1989 годзе. Тут жа надрукавана некалькі вершаў гэтага паэта з яго зборніка.

Пад рубрыкай «Далёкае і блізкае» Міхась Белямук успамінае пра тое, як стваралася Беларуска-Амерыканскае Задзіночанне ў Амерыцы (БАЗА), як закладвалася беларуская арганізацыя ў Кліўлендзе. У нумары чытач знойдзе некалькі вершаў Масея Сяднёва з цыкла «Біблейска-гіранічныя вершы» і апавяданне Святланы Белай «Максімава Ярaславія».

Пад рубрыкай «Чарнобыльскі шлях» Ірына Кісялёва ў сваім артыкуле «Чарнобыль: спроба аналізу сітуацыі» працягвае размову пра рэальны стан, у якім апынулася насельніцтва Беларусі ў выніку чарнобыльскай катастрофы. Тэме чарнобыльскай бяды прысвечаны таксама нарыс Кастуся Акулы «Вясёлыя блакітныя вочкі».

Нумар змяшчае кароткія нарысы, допісы з жыцця эміграцыі. Трэба адзначыць таксама мастацкае афармленне часопіса. У гэтым нумары ўвагу чытачоў павінны прыцягнуць афорты мастака Сямёна Геруса.

Л. БАРШЧЭЎСКАЯ.

«ЧАСОПІС»

У Беластоку выйшаў чарговы нумар (№ 9) інфармацыйна-культурнага штомесячніка ўсходняй Беласточчыны «Часопіс», які выдаецца на польскай і беларускай мовах. Штомесячнік рыхтуюць праваслаўныя студэнты, якія яшчэ помняць, што яны беларусы.

Беларуская «Праваслаўная старонка» ў часопісе адкрываецца гутаркай Вячаслава Харужага з настаяцелем парафіі св. Мікалая ў Торуні айцом Мікалаем Гайдучэнем і ягонай матушкай Надзеяй. У Торуні праваслаўныя з'явіліся яшчэ ў XVIII стагоддзі. Аднак дакументацыя, якая захавалася пра царкву і парафію, тычыцца толькі нашага стагоддзя. Пасля Першай сусветнай вайны ў Торунь і яго ваколіцы прыехалі праваслаўныя з Беларусі і Украіны. Тады ў праваслаўнай грамадзе налічвалася каля трох тысяч чалавек. Пасля Другой сусветнай вайны НКУС вывез праваслаўных парафіян у Сібір. Там яны, відаць, і загінулі. Цяпер парафія налічвае каля двухсот чалавек.

Чытачы «Часопіса» з цікавасцю пазнаёмяцца з інфармацыяй пра «Басовішча-91», якое адбылося ў Гарадку, што недалёка ад Беластока. Арганізатарам гэтай імпрэзы з'яўляецца Беларускае аб'яднанне студэнтаў. На «Басовішчы-91» выступілі музычныя гурты з Беларусі: «Мясцовы час», «Мроя», «Грамада», «Новае неба», беластоцкая «Альбаросіка», а таксама выканаўцы аўтарскай песні: С. Сокалаў-Воюш, К. Камоцкая, Э. Бэзюк, В. Шалкевіч, А. Камоцкі, кампазітар Зм. Яўтуховіч і іншыя.

Пад рубрыкай «З беларускага руху» друкуецца артыкул «Здабыткі бязбожніцтва».

У выданні змешчаны «Адказ на анкету рэдакцыі «Часопіса», якую падрыхтаваў Сакрат Яновіч. На літаратурнай старонцы можна пазнаёміцца з вершамі Уладзіміра Місюка. Тут жа друкуецца выказванне Мітрапаліта Менскага і Гродзенскага, Патрыяршага Экзарха ўсяе Беларусі Філарэта: «Свяшчэннае Пісанне разглядае страту мовы як самае цяжкае пакаранне, якое толькі Бог можа накласці на чалавека. А ў жыцці святога роўнаапостальнага Кірылы каштоўнасць роднай мовы цэніцца вышэй за золата, серабро і каштоўныя камяні. Таму я лічу, што захаванне і развіццё беларускай мовы з'яўляецца адной з самых важных задач беларускага культурнага адраджэння». Да гэтага выказвання «Часопіс» дадае наступны каментарый: «Калі страта мовы — «самае цяжкае пакаранне», дык самы цяжкі грэх кладзецца на душу тых, хто пайшоў супраць Свяшчэннага Пісання, хто спрычыніўся да страты беларусамі сваёй мовы. Колькі сёння святароў Беларускай Праваслаўнай Царквы ў Беларусі, падпарадкаванай Маскве, могуць, паклаўшы руку на сэрца, сказаць: я не спрычыняўся да страты маімі вернікамі роднай мовы? Колькі святароў БПЦ сёння гатовы шчыра ўзяцца за адраджэнне беларускай мовы як за «адну з самых важных задач»? Што робіць канкрэтна Сінод БПЦ, каб як найхутчэй выканаць гэтую «адну з самых важных задач»?»

В. ШНІП.

Радавод

«Литвин-белорусец из Копыси»

(Нататкі гісторыка-аматара)

(Заканчэнне.
Пачатак у № 35).

Захопленыя гарады засталіся часова за Масквой. Іхнія жыхары мусілі пераходзіць пад вяршэнства Масквы, а цар дадаў у свой тытул «і Белыя Русі». У 1659 годзе ў Маскве быў створаны нават «Литовский приказ» (міністэрства). Хаця згодна з Андрусаўскім мірам ў 1667 годзе да Масквы адышоў толькі Смаленск «с уездами, то есть Дорогобуж, Белая, Навль, Себеж, Красное, також и Велиж, хотя издавна до воеводства Витебского належащий с своими местами и с уездами», тытулаванне цара захавалася. Але цар адчуваў, што яго валадарства тут часовае, і таму з Беларусі вывозілася да Масквы ўсё, шмат палонных і нанятых людзей, таксама не гідзіліся і лекамі, металамі, нават званамі з цэркваў.

Нягледзячы на захоп Беларусі, яе жыхары лічыліся іншаземцамі. Захавалася «челобітная» адзінаццаці палонных беларускіх майстроў «Оружейной палаты», якія скардзяцца на тое, што ім прыпынілі дачу віна, належачага як іншаземцам. І цар загадаў даваць ім па 4 чаркі гарэлкі, 2 куфлі піва і куфаль мёду штодзённа. У дачыненні да гэтага згадваю размову рабочых Маскоўскага дарагамілаўскага хімзавода, якія абураліся тым, што калі яны выпіваюць, іх ледзь не бізунамі хвошчуць, а побач французы-мантажнікі харчуюцца ў асобнай сталовай, дзе п'юць віно нават у час працы.

Беларускія майстры шмат зрабілі для аздобы Масквы. Гартаю брашуру для турыстаў: «Только в 1666 году, после перевода в Московскую оружейную палату белорусских мастеров изразцового производства, искусство изготовления полихромной керамики приняло широкий размах. Известны имена тех славных умельцев — Степан Иванов по прозвищу Полубес, Игнат Максимов, Самошка Григорьев... Полубес, белорусский мастер, еще в юности привезенный «полоном» из литовских земель в Россию...». «Такого высокого подъема в изготовлении и использовании изразцов, как это было в русском зодчестве второй половины XVIII века, не наблюдалось более ни в одну из художественно-стилистических эпох отечественного искусства». (Т. И. Гейдор «Москва, XVIII век. Зодчество, изразцовые декоры». М., 1990). Менавіта з удзелам беларускіх дойлідаў і майстроў узнікла так званае знакамітае «нарышкинское барокко» — гэта агульнавядома.

Вывозілі лекараў, збройных майстроў, ювеліраў, ганчароў, ды гэтак інтэнсіўна, што нават кіраўнікі акупацыйных улад прасілі пакінуць хоць аднаго на горад.

У верасні 1658 года цар загадаў ажыццявіць перапіс «литовских людей» у Маскве. Згодна перапісу ў той час тут аказалася 243 беларусы (дакладней, сем'і), што жылі вольна. Не ўлічаны майстры «Оружейной палаты», яны жылі асобна (блізу 30), а таксама палонныя ў валоданні феадалаў, якіх было значна больш.

Месца паходжання адзначана для 193 з 243. Гэта Шклоў — 76 (альбо 40%), Дуброўна — 46 (24%), Смаленск з уездамі — 31 (16%), Копысь — 29 (15%). Астатнія па 1—2 з Суража, Вільні, Віцебска, Магілёва, Воршы, Гор, Дарагабужа, Трок. Прафесіі: розныя майстры (хлебнікі, швяцы, шаўцы, кафельшчыкі, ганчары і г. д.) — 123 (альбо 60%), мяснікі — 37 (18%), гандляры — 31 (15%), вайскоўцы — 6, жабракі — 1, беспрацоўныя — 7. Астатнія не адзначаныя.

Як зваліся тагачасныя беларусы? Іван (ці Янка) — 28 чалавек, Васіль — 13, Сямён — 12, Рыгор — 9, Мацвей — 8, Якаў, Кузьма і Андрэй — 7, Пётра — 6, Аляксей, Афанас, Восіп, Міхась, Павел, Хведар — 5, Барыс, Сяргей, Герасім — 4, Саўка, Самуіл (Самошка), Мікіфар — 3. Жанчыны зваліся Марыя, Ганна, Наталля, Аксіння, Таццяна, Кацярына, былі і Матрона, Дар'я, Усціння...

Наконт імёнаў цікава адзначыць, што сустракаецца запіс: «зовут-де его по-литовски Ян Мелешков, а во крещении Гришка Иванов сын, деревни Сиверы Динабупского повету» (1658).

Цікава таксама, што надпісы, зробленыя самімі беларусамі, напісаны лацінкаю, хаця і па-беларуску.

Трапіць у Маскву можна было адно з дазволу цара, якога чакалі ў Вязьме, дзе быў пабудаваны «Літоўскі гасцінны двор».

(«Шляхам Скарыны», № 2, 1991, Масква).

Алесь ДРАЕНКАЎ.

Створым гімн Рэспублікі Беларусь

Нядаўна Міністэрства культуры прыняло рашэнне аб правядзенні конкурсу па стварэнні тэкста і музыкі гімна Рэспублікі Беларусь. У творчым спаборніцтве могуць прыняць удзел як прафесійныя, так і непрафесійныя аўтары. Па ўмовах конкурсу будуць разгледжаны таксама творы, напісаныя раней беларускімі паэтамі і кампазітарамі. Першы тур адбудзецца ў снежні. Журы конкурсу ўзначальвае Ніл Гілевіч. Пачынаем друкаваць матэрыялы, дасланыя на конкурс.

З крыві беларускай

Гімн

Музыка і вершы Сяргея НОВІКА-ПЯЮНА

1.

З крыві беларускай зрадзілася воля,
І сталася вольнай навек Беларусь.
Народ беларускі сам выкаваў долю
І знішчыў навекі нядолю, прымус.

Шчаслівы, хто верыў у збаўленне народу,
Хто смела змагаўся за волю шмат год,
Між церняў калючых у буру-нягоду
Пад сцягам крывіцкім ішоў напярод.

2.

Палёгшым у змаганні вялікая слава!
Дала іх ахвяра пудоўны нам плод,
Праз кроў іх крывіцкая ўскросла дзяржава,
Праз кроў іх жыве беларускі народ.

Наперад ісці незалежніцкім шляхам
Наказваем дзецям і ўнукам сваім
Пад бел-чырвон-белым прадзедаўскім сцягам,
Пад знакам крывіцкай Пагоні святым.



Мая песня з катаржных нараў

Пасля гітлераўскага лагера смерці Калдычэва, выратаваны падчас расстрэлу 4 ліпеня 1944 года партызанамі, я трапіў затым на катаргу ў запалярную Якуцію. Голад і холад зрабілі сваю злую справу — здало сэрца. Я трапіў у так званы «полустационар». Гэта быў драўляны барак, абмазаны зялёнай глінай. У аконным праёме замест шкла — мяшок. Двухпавярховыя нары зроблены не з дошак, а з тонкіх дрэўцаў. Ні пасцельнай бялізны, ні коўдраў — нічога. Лекар Міхаіл Рыгоравіч Нікалаеў дазволіў мне ляжаць у бавоўняным фрэнчыку, хоць усе хворыя былі абсалютна голыя. Калі вярталася прытомнасць, вачэй не расплюшчваў, дзівіўся, чаму не паміраю. Сябры па нядолі думалі, што я працягваю быць непрытомным, а я тым часам складаў вершы і мелодыю гімна «З крыві беларускай». Песню я захаваў у памяці, бо ва ўмовах катаргі не мог запісваць, ды не было ні паперы, ні алоўка. Мой нумар на катарзе быў 417393.

Сяргей НОВІК-ПЯЮН.

І смех і грэх

Любоў ЛАМЕКА

Іду на Кардэна!

УСЁ! З мяне хопіць! Абяцанняў, эксперыментаў, новых праграм. Пераваротаў на дзяржаўным і мясцовых узроўнях. Утапілася б ад такога жыцця, дык вада халодная...

Акрамя скалочаных нерваў нічога ў сям'ю не прынёс і хвалёны рынак. Калі не сказаць больш — вынес з яе. Першымі — кнігі. Хто мог падумаць, што сын раптам зацікавіцца класікай? У тым сэнсе, што цішком вынясе на чорны рынак лепшых аўтараў. Спахапілася, ды позна: «падмёў» амаль усё, што мог. Трэба было трымаць вочы і на патыліцы! Злітаваўся толькі над «Маленькім прынцам» Антуана дэ Сент-Экзюперы: маўляў, кніга яго дзяцінства.

Скрычалася за вечар, сплакалася. А ён так дзіўнаназіраў за мною, а потым і кажа: «Немаведама чаго ўсхадзілася! Ты ж іх ніколі не брала з паліцы! А я, між іншым, для цябе ж стараўся. Цяпер не трэба мне грошай на варанкі даваць: за выручку я не толькі варанкі, але і туфлі «на трактарах» куплю!»

А таго не разумее няўдаліца, што калі класікі ў хаце (вядома, не сучасныя),— чалавекам сябе адчуваеш. У магутным разумовым біяполі жывеш. Нават шлакабетонныя сцены «хрушчоўкі» як бы адступаюць. Цяпер во адразу адчула, як яны пайшлі на мяне ў наступ. Пэўна, класіка магутную надзейную аўру забяспечвала ў кватэры.

Свой жа розум квёленькі. Што такое поўны курс нашага інстытута, усе, хто «вывучыўся», добра ўяўляюць. З гісторыі, напрыклад, толькі і помню: Кутузава ў Філях, Суворава ў Альпах ды кіруючую і накіроўваючую. І так яна моцна скавала мой мозг, гэтая кіруючая і накіроўваючая, што і па сённяшні дзень ён ніяк не можа працаваць самастойна. А пры нашым курсе на поўную незалежнасць і суверэнітэт у гэтай з'яве тоіцца вялікая небяспека...

Дачка, яна малодшая за сына па ўзросту, і да класікі не дарасла. Але ў будучым рынку месца таксама шукае. Прыходжу нядаўна з работы, а на кухні — гармідар. Паўкласа сабралася. З шафаў і халадзільніка ўсе запасы выцягнулі: муку, цукар, масла, яйкі, маянэз, ваніль... На ўсіх чатырох канфорках і ў духоўцы прысмакі гатуюць. Хто пячэ тварожныя пальчыкі, хто пячэнне, хто арэшкі. Адным словам, справа на паток пастаўлена.

Мяне, як токам, працяла: двухмесячныя запасы ляснуліся! А запэцканыя кулінары мне амаль хорам (саліравала, вядома, дачка): «Заўтра ў школе — вечар. Дык мы сваім печывам гандляваць будзем. І смачней, і танна, і грошы на свае патрэбы заробім...»

Каму танна, а па маёй кухні як пажар прайшоўся...

У маці-пенсіянеркі таксама прадпрымальніцкі талент прарэзаўся. Праўду кажуць: да чыёй галавы дойдзе, той і за печкай знойдзе. Амаль усе пакаёвыя кветкі вынесла старая на Камароўку. Пад выглядам іх небяспечнасці для здароўя. Маўляў, праверыла вазоны мудрамерам Дзічава, дык некаторыя адмоўна-разбуральную энергію маюць. Каму патрэбны ў хаце такія кветкі — міны замаруджанага дзеяння?!

А яшчэ сабрала мая руплівіца ўсе старыя-новыя дзіцячыя сукеначкі, касцюмчыкі, футрачкі і туды ж — на кірмаш! Дзеткі выраслі хутка, кажа, а рэчы зносіць не паспелі. Яны, як новыя, выглядаюць, мо, хто і купіць. З тыдзень хадзіла старая, пакуль усё не прадала. Раптоўна і ногі перасталі балець, і ў вушах шум суняўся. Мусіць, ад усведамлення, што да пенсіі салідны прыварак будзе. Вунь як дорага каштуюць сёння дзіцячыя рэчы!

Праўда, без крыку тут таксама не абышлося. Лямант дачка падняла. Аказваецца, ранейшае мерапрыемства дало ім такі добры плён, што яны вырашылі пашырыць вытворчасць і цяпер на продаж шыюць лялькам моднае адзенне са сваіх старых рэчаў. А ў маёй дачкі з-за бабулі ў адначассе «сыравіны» не стала. Слёз было, не раўнуючы, як па пакойніку. Нават пагрозы сыпаліся! Адно добра. Нарэшце бабуля сама пераканалася ў тым, што ўнукаў гадаваць — як гарачыя камяні глытаць. Фуканнем не адбудзеш!..

Папераджэ прагрэсу мужык пайшоў. Тут паўмерамі не абышлося. Рэформы былі самыя нечаканыя і ашаламляльныя. Звычайны школьны настаўнік-філолаг, які больш дзесятка гадоў спасцігаў разам з вучнямі канцэпцыю сацыялістычнага рэалізму, кінуўся зарабляць грошы ў малым прадпрыемстве, стаў кааператарам. І цяпер, ніколечкі не шкадуючы, робіць... папяровыя кветкі. На букеты, вянкі, вяночкі...

У апошні час у яго развіўся нейкі нездаровы густ на нетрадыцыйную паперу. Падбірае тую, што шамаціць, блішчыць, пераліваецца. І што мяне асабліва бянтэжыць, неяк падазрона стаў прыглядацца да фінскіх шпалераў «Ружовыя мроі», якімі паклеена зала. У мяне нават узнікла было падазрэнне, што можа... Але, дзякуй Богу, благія думкі не пацвярджаюцца. Мысліць ён канцэптуальна, як модна сёння гаварыць, разважае зусім лагічна.

Мяне атакуе кожны дзень: у другіх, папракае, жонка трымае хату за тры вуглы, мужык — за чацвёрты, а ў нас (з-за маёй неразваротлівасці, марудлівасці) усё наадварот. Ну колькі можна сядзець на рабоце, абураецца ён, сям'я гушчу любіць. Каб з крыніцы напіцца, трэба нахіліцца!

Наконт крыніцы, то няхай лепш памаўчыць. Гэта яго работа — крыніца?! А дзе ж, у такім разе, лужына? Калі я і выспею для ТАКОГА рынку, то сваіх высокіх памкненняў усё роўна не размяняю. Нізавошта! Нават калі ў сферу быту прыйдзецца перайсці з нашай навуковай установы. Я яму так і сказала: папяровыя кветачкі ў падвальнай канторы — не для мяне! Такую маеш славу, якую робіш справу. А слава — мая слабасць!

Мяркую так. Калі раптам скароцяць нашу ўстанову (такія размовы ўжо ідуць), ніжэй Дома моды я не апушчуся. Пэўны талент, эстэтычны густ у мяне ёсць. Іх толькі развіць трэба. Працаваць — дык «пад П'ера Кардэна»! Ці... не. Не-не! Ад нашага Зайцава я не ў захапленні! Пераадолець псіхалагічны бар'ер «ТАМ, ІХНЯЕ, ЯНЫ — тут, наша, мы» дужа няпроста.

ІДУ НА КАРДЭНА!!!

Лякарня чараўніцы Потахі

Рамонак. Акрамя тых выпадкаў, пра якія гаварылася ў папярэдніх нумарах, рамонак ўжываюць, калі ад недабраякаснага харчу ўзнікае ўздуцце жывата, а іншы раз і пухліна (як пры вадзянцы). Тады спачатку прымаюць слабіцельнае (звычайна касторку) і затым пачынаюць піць чай з сумесі рамонку, ягад ядлоўцу, травы перцавай мяты, святаянніку, цвінтарэю — кожнага ў роўных частках. 4 сталовыя лыжкі сумесі на 1 л вады кіпяцяць не болей 10 мінут, а калі астыне, п'юць па 3 шклянкі ў дзень.

Пры болях у жываце п'юць круты напар з рамонку і мелісы, змешаных пароўну. П'юць гарачым па 3 шклянкі ў дзень.

Калі лечаць рожу, бяруць у рукі крэсіва і крэмень і шэпчуць: «Красаю, б'ю, тну, высякаю, агонь дабываю. Як агонь сыплецца, так каб рожа высыпалася». Гэта шэпчуць тры разы. (Нікіфароўскі).

Чарніцы. Найпапулярнейшая народная лекавая расліна, асабліва яе ягады як сушаныя, так і свежыя, а таксама засыпаныя цукрам. Ужываюць пры нястраўнасці, болях у страўніку і кішэчніку і пры паносах. Свежыя ягады часцей ужываюць пры катары страўніка, а сушаныя — у адвары ці крутым напары пры катары кішак, сапсаванні жывата і паносах.

Народная медыцына ўжывае таксама ягады чарніц у сумесі з ягадамі суніц. Для гэтага ўвесь сунічны перыяд, які працягваецца звычайна каля 3 тыдняў, хворыя на хранічнае сапсаванне жывата, катар страўніка і паніжаную кіслотнасць страўнікавага соку і хворыя на малакроўе, прымаючы чарніцы, ядуць і суніцы.

Суніцы і чарніцы асобна, у сумесі і чаргуючы рэкамендуецца есці пры камянях нырак, у тым ліку і пры вельмі балючых прыступах. У апошнім выпадку рэкамендуецца рабіць гарачыя ванны з адвару аўсянай саломы, змешанай (папалам) з травой хвашчу.

Пры цукровай хваробе рэкамендуюць чай з лісця чарніц (60 г на 1 л кіпетню). Пры частай у гэтых выпадках недастатковасці страўнікавых сокаў дадаюць лісце чарніц і іншых лекавых раслін. Пры гемараідальных кровацёках робяць клізмы з напару лісця чарніц (60 г на 1 л кіпетню).

Заўсёды, амаль без выключэння, адзначаецца высокая эфектыўнасць ад прыёму свежых ягад чарніц у вялікіх колькасцях пры падагры, раматусе і іншых відах хвароб, пры парушаным абмене рэчываў.

Для ягад чарніц, асабліва свежых, характэрная тая асаблівасць, што яны змацоўваюць кішэчнік пры паносах, у той жа час лечаць хранічныя запоры. Пры чарнічнай тэрапіі перыстальтыка прыходзіць у норму на вельмі працяглы час. Зыходзячы з гэтага, можна лічыць, што чарнічныя ягады — не толькі сродак, які змацоўвае кішэчнік (як гэта прынята лічыць у хатнім быце), а, больш правільна, сродак, які рэгулюе ці нармалізуе страўнікава-кішачныя функцыі.

АХВЯРАВАЛІ Ў ФОНД «НАШАГА СЛОВА»

1. Рагвалодскі Міндоўг Гедэмінавіч — Менская вобл.
2. Васіль Жуковіч — г. Менск.
3. Мікалай Латушкін (ЗША) — 50 дал.

Наш адрас: 220005, г. Мінск, вул. Румянцава, 13.
Тэлефон рэдакцыі: 33-17-83.

МВПА імя Якуба Коласа.
Мінская паліграфічная фабрыка «Чырвоная Зорка».
Наклад 5.254 паасобнікі. Зак. 2464. Індэкс 74975.

